# СЛОВА ТРЫМАЛІ ЦВЁРДА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Алег засмяяўся:

— Не абышлося без іх. З першых жа дзён знаходжання ў калгасе я застаўся басаног у прамым сэнсе гэтага слова. Справа ў тым, што пачатак верасня выдаўся сухім, і ў лесе, паблізу вёскі Кароткавічы, загарэўся тарфянік. Здарылася так, што я знаходзіўся недалёка адтуль. Да цемры дапамагаў двум леснікам і мясцоваму механізатару на трактары К-701 абворваць полымя, каб яно не перакідвалася далей. Важкі трактар не мог прайсці ў адным з нізкіх месцаў тарфяніка, давялося бегчы ў вёску, узяць другі трактар і ўжо пры свеце факела з саляркі да паўночы «адразаць» пажар ад густога сасновага лесу. Вось і згарэлі красоўкі. Добра, што ў калгасе боты выпісалі...

Асобна трэба сказаць вось аб чым. Нашаму атраду давялося працаваць там, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны стаяў фронт. Прайшло чатыры дзесяцігоддзі з той далёкай ваеннай пары, а яна да гэтага часу зласна нагадвае аб сабе — зямля як пірог «нашпігавана» металам. Шмат разоў даводзілася нам спыняць работу на бульбасартыравальным пункце, каб аднесці ў бок неўзарваўшыеся снарады, міны, гранаты, якія трапляліі сюды з поля разам з бульбай. Таму аб гэтым варта памятаць кіраўнікам, якія вязуць студэнтаў на ўборку бульбы, каб быць асабліва ўважлівымі, пільнымі.

...Вярнуліся байцы сельгасатрада «Эканаміст» ва універсітэт, прыступілі да заняткаў з пачуццём выканага абавязку. Дадзенае слова правесці асенні семестр з найвышэйшай прадукцыйнасцю працы яны стрымалі!

**Т. ДУБЯК.**

*Запрашае факультэт грамадскіх прафесій*

# ВЫБІРАЙ ПА ЗДОЛЬНАСЦЯХ

У гэтым годзе факультэт грамадскіх прафесій адзначыў свой дзесяцігадовы юбілей. Тысячы студэнтаў, якія навучаюцца на ФГП Гомельскага дзяржуніверсітэта, атрымалі другую (грамадскую) прафесію. Цяпер звыш 70 выпускнікоў працуе на камсамольскай рабоце, многія выпускнікі школы камсамольскага актыву, аддзяленняў атрадных важатых, метадыстаў-арганізатараў спартыўна-масавай і турыстычнай работы актыўна выкарыстоўваюць атрыманыя веды пры рабоце ў якасці класных кіраўнікоў у школах, прымаюць удзел у лекцыйнай прапагандзе.

На факультэце дзейнічае 11 аддзяленняў і школ, на якіх працягнуць навучанне 2057 слухачоў, пераведзеных на другі курс факультэта.

Пачаўся набор на 1-ы курс наступных аддзяленняў і школ факультэта грамадскіх прафесій:

I. Школа маладога лектара (тэрмін навучання 2 гады). У ёй працуюць секцыі:
— палітінфарматараў;
— міжнародных зносін;
— маральна - эстэтычных ведаў;
— навуковага атэізму;
— эканамічных ведаў;
— прапаганды спецыяльных навуковых ведаў.

II. Метадыстаў-арганізатараў камсамольскай работы (тэрмін навучання 1 год).

III. Атрадных важатых. Тэрмін навучання 1 год.

IV. Экскурсаводаў. Тэрмін навучання 2 гады.

V. Журналістыкі. Тэрмін навучання 2 гады.

VI. Арганізатараў культурна-масавай работы. Тэрмін навучання 3 гады.

Секцыі:
— кіраўнікі танцавальных калектываў;
— кіраўнікі тэатральных калектываў;
— кіраўнікі вакальна-інструментальных калектываў;
— кіраўнікі гурткоў і клубаў юных філатэлістаў.

VII. Сацыёлагаў. Тэрмін навучання 2 гады.

VIII. Метадыстаў-арганізатараў па ахове прыроды. Тэрмін навучання 2 гады.

IX. Метадыстаў-арганізатараў па турызму. Тэрмін навучання 1 год.

X. Народны універсітэт па ахове помнікаў гісторыі і культуры. Тэрмін навучання 2 гады.

XI. Метадыстаў-арганізатараў спартыўна-масавай работы. Тэрмін навучання 3 гады.

Секцыі:
— падрыхтоўкі грамадскіх інструктараў па відах спорту.
— падрыхтоўкі грамадскіх суддзяў па відах спорту.

Вучэбны працэс на факультэце грамадскіх прафесій будуецца ў адпаведнасці з вучэбна-метадычнымі планамі, рэкамендаванымі Мінвузам, Міністэрствам асветы БССР, Усесаюзным праўленнем таварыства «Веды», Домам палітычнай асветы Гомельскага абкома партыі. Праводзяць заняткі на факультэце кваліфікаваныя кадры.

Асаблівай увагі заслугоўвае школа маладога лектара, якая ўключае 6 секцый. У рабоце ШМЛ прымаюць актыўны ўдзел 176 выкладчыкаў універсітэта, з іх 99 маюць вучоныя ступені.

Адной толькі секцыяй спецыяльных навуковых ведаў падрыхтавана 314 лекцый, з якімі слухачы ШМЛ выступалі перад студэнцкімі аўдыторыямі, у школах і на прадпрыемствах горада. 25 слухачоў школы маладога лектара прыняты ў таварыства «Веды».

Агульныя заняткі праводзяцца ў школе маладога лектара 1 раз у месяц, заняткі па секцыях — 2 разы ў месяц. На агульных занятках школы маладога лектара чытаецца курс «Асновы лектарскага майстэрства». Ён падрыхтаваны выкладчыкамі кафедр палітэканоміі, педагогікі і псіхалогіі. У праграму агульных заняткаў уведзены таксама лекцыі па актуальнай тэматыцы, якая адлюстроўвае важнейшыя падзеі, што адбываюцца ў краіне і за яе межамі. Праграма агульных заняткаў складзена такім чынам, каб студэнты, слухачы ШМЛ, набылі неабходны мінумум ведаў і навыкаў у лектарскім майстэрстве, авалодалі методыкай вусных выступленняў, былі ў курсе важнейшых падзей.

Аддзяленне метадыстаў-арганізатараў камсамольскай работы запрашае ўвесь камсамольскі актыў універсітэта. На аддзяленні праходзяць навучанне ўсе катэгорыі выбарнага камсамольскага актыву. Задачай аддзялення з'яўляецца павышэнне палітычнай і дзелавой падрыхтоўкі выбарнага камсамольскага актыву.

У мінулым годзе адкрылася новае аддзяленне — экскурсаводаў, якім кіруе экскурсавод Гомельскага бюро падарожжаў і экскурсій В. Ларыёнаў. На гэтым аддзяленні ў 1984—1985 навучальным годзе працягнуць навучанне 160 слухачоў. Слухачамі аддзялення вывучаюцца выдатныя мясціны нашага горада, з якімі яны знаёмяцца ў працэсе навучання.

Слухачы аддзялення журналістыкі праходзяць тэарэтычную падрыхтоўку, знаёмяцца з усімі газетнымі жанрамі і праяўляюць сябе на практыцы, публікуючы свае артыкулы ў шматтыражнай газеце «Гомельскі універсітэт».

Аддзяленнем культурна-масавай работы кіруе былы выпускнік факультэта грамадскіх прафесій, дырэктар студэнцкага клуба «Маладосць» А. Лысянкоў. Клуб знаёміць з навінамі навукі, культуры, гісторыяй і традыцыямі універсітэта. Усе калектывы мастацкай самадзейнасці ГДУ актыўна рыхтуюцца да ўдзелу ў святах, тэматычных канцэртах. У гэтым навучальным годзе адкрываецца новая секцыя — кіраўнікоў гурткоў і клубаў юных філатэлістаў.

На правах аддзялення ФГП функцыяніруе народны універсітэт аховы помнікаў гісторыі і культуры. Рэктарам гэтага народнага універсітэта з'яўляецца заслужаны настаўнік БССР П. А. Дуброўскі. Студэнты знаёмяцца з культурна-гістарычнай спадчынай савецкага народа, з дасягненнямі марксісцка-ленінскай навукі ў справе вывучэння і выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры.

Па ўзгадненню з таварыствам аховы прыроды створана аддзяленне метадыстаў-арганізатараў па ахове прыроды. Кіраўнік аддзялення — асістэнт кафедры батанікі і фізіялогіі раслін С. У. Аўсеенка. Слухачы вядуць барацьбу з браканьерствам, выступаюць з лекцыямі перад насельніцтвам горада і вобласці.

Новае двухгадовае аддзяленне сацыёлагаў, кіраўніком якога з'яўляецца кандыдат філасофскіх навук А. П. Касьяненка, ставіць сваёй задачай пашырыць спецыяльную падрыхтоўку студэнтаў, прывіць навыкі да практычнай сацыялагічнай работы.

Пры факультэце грамадскіх прафесій праводзіць заняткі школа атраднага важатага. Слухачы вывучаюць асновы педагогікі і псіхалогіі, тэорыю і методыку піянерскай і камсамольскай работы, творча прымяняюць набытыя веды і ўменні на практыцы. Заняткі праводзіць кандыдат педагагічных навук В. П. Горленка, дапамогу ў падрыхтоўцы слухачоў аддзялення аказвае гарадскі Палац піянераў і школьнікаў.

Аддзяленне спартыўна-масавай работы ўключае дзве секцыі: падрыхтоўкі суддзяў па відах спорту і падрыхтоўкі грамадскіх інструктараў па відах спорту. На аддзяленні 12 падсекцый: канькабежны спорт, лёгкая атлетыка, спартыўная гімнастыка, плаванне, ручны мяч, баскетбол, футбол, спартыўнае фехтаванне, ГПА, стралковая і інш.

Аддзяленне інструктараў-метадыстаў па турызму вялікую ўвагу ўдзяляе формам і метадам правядзення турысцкай работы, непасрэднай арганізацыі паходаў (турысцкай амуніцыі, харчаванню ў паходзе, тапаграфіі і арыентаванню на мясцовасці, правілам радыёабмену).

Факультэт грамадскіх прафесій запрашае ўсіх жадаючых на свае аддзяленні. Заявы падаваць у камітэт камсамола ГДУ (галоўны корпус універсітэта, аўдыторыя 4-17).

**Л. ГАЛЕЕВА,**
**метадыст факультэта грамадскіх прафесій.**

# КУРАТАРСКАМУ ПЛАНУ — ДАКЛАДНАСЦЬ І КАНКРЭТНАСЦЬ

Адбылося першае ў бягучым навучальным годзе пасяджэнне савета куратараў універсітэта. На ім былі абмеркаваны прынцыпы складання планаў выхаваўчай работы і формы справаздачнасці куратараў студэнцкіх груп.

Прызнана неабходным звярнуць іх увагу на захаванне ў працэсе планіравання прынцыпаў партыйнасці, навуковасці, мэтанакіраванасці, комплекснасці і ўліку спецыфічных асаблівасцей факультэта і групы. Зыходзячы з іх, у плане выхаваўчай работы на семестр павінны, у прыватнасці, знайсці адлюстраванне пастановы ЦК КПСС «Аб 40-годдзі Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 г.» і «Аб далейшым паляпшэнні партыйнага кіраўніцтва камсамолам і павышэнні яго ролі ў камуністычным выхаванні моладзі», а таксама «Асноўныя напрамкі рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы».

Прытрымліваючыся пералічаных прынцыпаў, куратар павінен дакладна вызначыць вядучыя задачы выхаваўчай работы на наступны семестр і намеціць шляхі іх вырашэння. Правільна зрабіць гэта можна на аснове ўліку вынікаў вучобы і ўзроўню выхаванасці студэнтаў групы. У плане павінна атрымаць адлюстраванне і галоўная перспектыва знаходжання маладога чалавека ў ВНУ — атрыманне універсітэцкай адукацыі і адпаведнай спецыяльнасці. Зыходзячы з пастаўленых мэт, куратар выдзяляе асноўныя напрамкі выхаваўчай работы ў групе. Як правіла, гэта дзейнасць па развіццю студэнцкага калектыву, стымуляванне вучэбнай і навуковай работы студэнтаў, ідэйна-палітычнае, маральнае, прававое, працоўнае выхаванне і прафарыентацыя, культурна-масавая і індывідуальная работа са студэнтамі і інш. Натуральна, што плануючы канкрэтныя мерапрыемствы па даных напрамках, неабходна ўзгадніць іх з камсамольскім і прафсаюзным актывам групы.

У адпаведнасці з «Палажэннем аб куратару студэнцкай групы», куратар абавязан весці дзённік, які з'яўляецца яго асноўным справаздачным дакументам. На савеце было падкрэслена, што гэты дзённік павінен па меншай меры змяшчаць наступныя раздзелы: звесткі аб саставе групы, агульная характарыстыка асаблівасцей групы і асноўныя выхаваўчыя задачы на семестр, план выхаваўчай работы на семестр, улік праведзеных мерапрыемстваў. Кожны з куратараў павінен на працягу навучальнага года зрабіць справаздачу аб сваёй дзейнасці.

**А. ЛЫТКО,**
**старшыня савета куратараў універсітэта, асістэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі.**

# КОМПАС У АКІЯНЕ ФІЛАТЭЛІІ

Адным з самых распаўсюджаных захапленняў, асабліва сярод моладзі, з'яўляецца калекцыяніраванне. У сваю чаргу, з усіх яго відаў самы распаўсюджаны і, бадай, найбольш цікавы — філатэлія, калекцыяніраванне знакаў паштовай аплаты.

Не сакрэт, што да нядаўняга часу на філатэлістаў глядзелі як на дзівакоў. Сёння гэта памылковая думка ў мінулым. Цяпер філатэлію лічаць карысным і актыўным заняткам, які дапамагае зведваць свет. Філатэлія садзейнічае пашырэнню і паглыбленню ведаў, якія набываюць у школе, прывівае цікавасць да вывучэння помнікаў матэрыяльнай культуры, палітычных і гістарычных падзей, навукі, мастацтва і прыроды, садзейнічае фарміраванню дапытлівасці, густу, любві да прыгожага, эфектыўна садзейнічае патрыятычнаму выхаванню.

Савецкай філатэліі ўласцівы высокая партыйнасць, грамадзянскасць, яна выконвае важныя агітацыйна-прапагандысцкія функцыі. Усесаюзнае таварыства філатэлістаў з'яўляецца добраахвотнай масавай грамадскай культурна-асветнай арганізацыяй, асноўная задача якой заключаецца ва ўсебаковым выкарыстанні філатэліі ў якасці сродку камуністычнага выхавання працоўных і савецкай моладзі.

Цяга маладых людзей, асабліва школьнікаў, да філатэліі значна ўзрасла за апошнія гады. Гэта ў сваю чаргу прывяло да стварэння ў школах і пазашкольных установах шырокай сеткі гурткоў і клубаў юных філатэлістаў. Каб дзейнасць гэтых грткоў і клубаў у найбольшай меры адказвала сучасным патрабаванням фарміравання новага чалавека, неабходна мэтанакіраванае педагагічнае кіраўніцтва развіццём культурна-пазнаваўчых інтарэсаў школьнікаў сродкамі філатэліі. У мэтах узбраення будучых настаўнікаў сістэмай ведаў па асновах філатэліі, падрыхтоўкі іх да кіраўніцтва філатэлістычнымі гурткамі і клубамі Міністэрства асветы СССР распрацавала і накіравала ва ўсе педагагічныя вучэбныя ўстановы праграму для факультэтаў грамадскіх прафесій «Асновы савецкай філатэліі». Пaспяхова вядзецца падрыхтоўка кіраўнікоў дзіцячых і юнацкіх клубаў філатэлістаў ва Ульянаўскім, Смаленскім, Кішынёўскім і многіх іншых педагагічных інстытутах, у радзе універсітэтаў краіны.

Задача новай секцыі, якая адкрываецца на факультэце грамадскіх прафесій ГДУ, — узброіць будучых кіраўнікоў гурткоў юных калекцыянераў сістэмай агульных і спецыяльных філатэлістычных ведаў, навыкамі, неабходнымі для работы са школьнікамі. Студэнты атрымаюць уяўленне аб сацыяльна-палітычных асновах калекцыяніравання, вывучаць гісторыю пошты і філатэліі, методыку і тэхніку калекцыяніравання, а таксама псіхолага-педагагічныя асаблівасці работы з юнымі філатэлістамі. Змест курса дазваляе падрыхтаваць студэнта да шырокага выкарыстання філатэліі як на уроках, так і ў пазакласнай рабоце.

Студэнты, якія завершаць двухгадовы курс навучання ў секцыі, здадуць залікі і аформяць метадычны дапаможнік або фрагмент тэматычнай калекцыі.

КАЛІ ЛАСКА, У СЕКЦЫЮ ГУРТКОЎ ЮНЫХ ФІЛАТЭЛІСТАЎ!

**І. НЯМКЕВІЧ,**
**кіраўнік секцыі.**

# ПЯСНЯР НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПОДЗВІГУ

## Да 170-годдзя з дня нараджэння М. Ю. Лермантава

У ГЭТЫЯ дні ў нашай краіне і за яе межамі шырока адзначаецца 170-годдзе з дня нараджэння вялікага рускага паэта Міхаіла Юр'евіча Лермантава.

Усяго дваццаць шэсць гадоў і некалькі месяцаў пражыў паэт. Вельмі кароткі тэрмін адпусціў яму лёс. Трагедыя асабістага лёсу паэта — гэта трагедыя сучаснага яму грамадскага жыцця. Лермантаў належаў да пакалення, якое разбуджана вялікім днём 14 снежня 1825 года і асуджана на вымушаную бяздзейнасць. Раздумваючы над лёсам сучаснікаў, ён пісаў:

**К чему глубокие познанья, жажда славы,**
**Талант и пылкая любовь свободы,**
**Когда мы их употребить не можем?**

Чым далей ад нас дата нараджэння вялікага суайчынніка, тым глыбей мы ўсведамляем значэнне лермантаўскай спадчыны і ганарымся паэтам рускім, народным у найвышэйшым значэнні гэтага слова.

Міхаіл Юр'евіч Лермантаў нарадзіўся ў Маскве ў 1814 годзе. Яму не споўнілася і двух з паловаю гадоў, калі памерла яго маці. Цяжка перажываў маленькі Міша сямейны разлад бабулі, якая горача любіла ўнука, з бацькам.

У 1830 годзе выходзіць першы друкаваны верш будучага паэта «Вясна». Гэта былі гады вучобы спачатку ў Шляхетным пансіёне пры Маскоўскім універсітэце, куды ўладкавала ўнука бабуля Елізавета Аляксееўна Арсеньева, а потым — у самім універсітэце (1828—1832).

Вясной 1832 года Лермантаў пакідае Маскоўскі універсітэт, адкуль яму «параілі пайсці» за рэзкія водгукі і сутычкі з начальствам, і вырашае перайсці ў Пецярбургскі універсітэт. Пасля няўдалай спробы стаць студэнтам Лермантаў трапляе ў Школу гвардзейскіх падпрапаршчыкаў і кавалерыйскіх юнкераў. Менавіта ў гэты час нараджаецца пад пяром паэта магутны вобраз яго паэзіі — вобраз буры і чалавека, народжанага для буры:

**А он, мятежный, просит бури,**
**Как будто в бурях есть покой!**

Знаёмства з арыстакратычным Пецярбургам дазволіла Лермантаву даць бязлітасны аналіз сучаснага яму сацыяльнага асяроддзя, нораваў свецкіх колаў. У творчасці паэта з'яўляюцца рэалістычныя тэндэнцыі (драма «Маскарад»).

1837 год. Напісаны сотні лірычных вершаў, дзесяткі паэм, але менавіта гэты год лічыцца пачаткам паэтычнага лёсу «малодшага» паэта. «Калі б ведаў паміраючы Пушкін, — піша адзін з каментатараў, — што прыйшоў і стаіць каля яго дома Міхаіл Лермантаў... — можа быць, усе свае самыя апошнія сілы Пушкін аддаў бы ўжо Лермантаву! Прысягаючы на вернасць гераічнаму, Лермантаў піша верш на смерць Пушкіна, верш, які, па ўспамінах стрыечнага брата Лермантава М. Д. Юр'ева, «нарабіў столькі шуму, і нягледзячы на тое, што нідзе не надрукаваны, паставіў раптам нашага школьнага паэта амаль на ўзровень з тым, каго ён у сваіх цудоўных вершах аплакваў». Паэт абараніў паэта, у заключных гнеўных радках ён вырашае ідэю найвышэйшага — народнага — суда:

**А вы, надменные потомки...**
**Вы, жадною толпой стоящие у трона,**
**Свободы, Гения и Славы палачи!..**

Амаль у адзін час з гэтым творам паэт стварае аўтабіяграфію народнага подзвігу — паэму «Барадзіно» — як водгук на 25-ю гадавіну Барадзінскай бітвы. Паэма з'явілася цэлай эпохай у развіцці рускай літаратуры, а яе стварэнне Лермантавым можна назваць вялікім нацыянальным подзвігам.

**— Да, были люди в наше время,**
**Не то, что нынешнее племя:**
**Богатыри — не вы!**

У гэтых словах адчуваецца смутак аб «магутным, удалым племені», якое знікла з часамі «вялікіх бітваў». Можна меркаваць, што Лермантаў апярэдзіў вялікага Талстога ідэяй сваёй паэмы, распрацоўкай народнага характару і народнага подзвігу.

«Смерць паэта» і «Барадзіно» не засталіся па-за ўвагай царскіх улад — Лермантава пераводзяць на Каўказ у Ніжагародскі драгунскі полк, які ваяваў супраць горцаў. Так хацелі расправіцца з паэтам. Аднак ці можна было запалохаць чалавека, якога прыгняталі адносіны з людзьмі вялікасвецкага грамадства і які сам шукаў разнастайных уражанняў? Некалькі пазней Бялінскі скажа, што ў Лермантава ў «халодным і азлобленым поглядзе на жыццё» схаваны «зерні глыбокай веры» ў вартасць чалавека. Лермантаў правяраў свае чалавечыя якасці ў смяротным баі з ворагам.

У 1838—1840 гадах Лермантаў служыць у Ноўгарадзе, потым у Пецярбурзе. За гэты перыяд ён надрукаваў «Песню пра цара Івана Васільевіча, маладога апрычніка і ўдалога купца Калашнікава», стварыў паэму «Мцыры» і завяршыў паэму «Дэман», — творы, кожны з якіх быў з'явай у рускай літаратуры.

Як аб моцным і самабытным дараванні ў нашай літаратуры гаворыць упершыню аб Лермантаве вялікі рускі крытык Бялінскі: «Божа мой! Які раскошны талент!.. Якая вобразнасць — так усё і бачыш перад сабою, а ўбачыўшы раз, ніколі ўжо не забудзеш! Дзівосная карціна — так і блішчыць усёю яркасцю ўсходніх фарбаў! Якая маляўнічасць, меладычнасць, моц і сіла ў кожным вершы, асобна ўзятым!»

Вясной 1840 года за дуэль з сынам французскага пасланніка ў Пецярбурзе Лермантава пераводзяць у дзеючую армію, якая вяла баі на Паўночным Каўказе. Паэта зноў пасылалі пад кулі. А ў Пецярбурзе неўзабаве пасля ад'езду Лермантава выходзіць з друку раман «Герой нашага часу», завершаны ў час двухгадовага знаходжання паэта ў сталіцы. Гэта яго цэнтральны твор — «...партрэт, сабраны з заганаў усяго нашага пакалення, у поўным іх развіцці»,— як кажа сам паэт. Раман «Герой нашага часу» з'яўляецца непасрэдным працягам тэмы «Барадзіно», гэта значыць тэмы героя і часу. Але гэта ўжо іншы герой, іншы час, аб якіх сам паэт напісаў у прадмове: «Хопіць і таго, што хвароба паказана, а як яе вылечыць— гэта ўжо бог ведае!» Сучасная Лермантаву эпоха — гэта час упадку і дэгераізацыі, час дробных парыванняў і канфліктаў. Псіхалагічнай праўдай, сілай абагульнення паэт развенчвае свайго рамантычнага героя, якім ён хацеў паказаць Пячорына.

Усемагутнае, развітае пачуццё адзінства Лермантава—гэта натуральнае пачуццё сына сваёй Радзімы, які не можа прымірыцца з «гнуснай расійскай рэчаіснасцю».

**Люблю отчизну я, но странною любовью!—**

піша паэт у вершы «Радзіма» (1841), які стаў як бы развітальным яго словам.

15 ліпеня 1841 года ля гары Машук у Пяцігорску паэт быў забіты на дуэлі, а 17-га ліпеня — пахаваны на пяцігорскіх могілках.

Усяго дваццаць шэсць гадоў і некалькі месяцаў... Паэт, у якім пры жыцці ўбачылі новае магутнае дараванне на Русі, «трэцяга рускага паэта» і нашчадка Пушкіна, абяцаўшага нешта большае, нешта бясконцае, паўтарыў трагічны лёс свайго вялікага папярэдніка. «...як мала абставіны, якія яго акружалі, садзейнічалі сур'ёзным заняткам,... становіцца ледзь зразумелым, як ён мог дасягнуць тых бліскучых вынікаў пры настолькі малой працы і ў такіх маладых гадах», — напіша ў сваіх успамінах забойца паэта Мартынаў.

Бялінскі марыў аб тым часе, калі імя Лермантава ў літаратуры стане народным іменем, і гарманічныя гукі яго паэзіі будуць лунаць у штодзённай гаворцы грамады, паміж яе думкамі аб жыццёвых клопатах.

Імя Лермантава стаіць побач з імёнамі Пушкіна і Гогаля. Яны паклалі пачатак выдатнай з'яве, якая носіць назву «Руская класічная літаратура».

**А. ВЛАСАЎ,**
**асістэнт кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства.**



ВОСЕНЬ ЗАЛАТАЯ.

*З вамі гутарыць урач*

## ПРАФІЛАКТЫЧНЫЯ ПРЫШЧЭПКІ

Вучоныя адкрылі магчымасць стварэння неўспрымальнасці арганізма да некаторых заразных хвароб штучным шляхам — пры дапамозе прафілактычных прышчэпак. Звычайна іх праводзяць вакцынай — аслабленымі або забітымі ўзбуджальнікамі інфекцыйных хвароб. Гэтыя ўзбуджальнікі пры ўвядзенні ў арганізм чалавека не выклікаюць захворвання, а выпрацоўваюць імунітэт — неўспрымальнасць да пэўных відаў інфекцыі.

Супрацьтуберкулёзная вакцына — БЦЖ — засцерагае чалавека ад захворвання туберкулёзам. Першая прышчэпка, якая праводзіцца пры нараджэнні дзіцяці, называецца вакцынацыяй, а ўсе астатнія, што паўтараюцца праз кожныя 5 гадоў, — рэвакцынацыяй. Рэвакцынацыя праводзіцца асобам да 30 гадоў уключна пры ўмове, што імунітэт не выпрацаваўся пры папярэдняй прышчэпцы.

Вельмі часта, і асабліва ў зімовы перыяд, людзі хварэюць грыпам. Ён небяспечны сваімі ўскладненнямі: запаленнем лёгкіх, гаймарытам, атытам, міякардытам і інш. Для прафілактыкі грыпа выкарыстоўваецца супрацьгрыпозная вакцына розных тыпаў. Адна з іх распыляецца ў нос пульверызатарам, другая — ўводзіцца з дапамогай ін'ектара пад скуру. Пасля правядзення прышчэпак у невялікай часткі людзей можа з'явіцца недамаганне і павышэнне тэмпературы да 37,5 градусаў. Працягласць рэакцыі — не больш двух сутак. Мясцовая рэакцыя выражаецца ў пачырваненні скуры і прыпухласці на месцы прышчэпкі. Людзі, якім уведзена супрацьгрыпозная вакцына, амаль на хварэюць грыпам. Калі ж хвароба наступае, то яе пераносяць лёгка, без ускладненняў.

Слупняк — вострае інфекцыйнае захворванне, якое характарызуецца паражэннем нярвовай сістэмы. Крыніца інфекцыі — слупняковая палачка, распаўсюджаная ў знешнім асяроддзі, часцей за ўсё ў зямлі. Прафілактыка ажыццяўляецца планавай імунізацыяй слупняковым анатаксінам тройчы з адпаведнымі інтэрваламі. Калі чалавеку прышчэпкі зроблены планава, то пры атрыманні траўмы прышчэпкі не робяцца. Пры адсутнасці іх, даводзіцца ўводзіць чалавеку слупняковую сываратку па жыццёвых паказчыках,

**А. БАБУШКІНА,**
**урач-інфекцыяніст паліклінікі № 6, член таварыства Чырвонага Крыжа.**

# Інфармацыйны аддзел лабараторыі ТСН

## ПАВЕДАМЛЯЕ:

У Гомельскую абласную кантору кінапракату паступілі новыя навукова-папулярныя і вучэбныя кінафільмы:

**«Прафесія XXI стагоддзя»**, 2 часткі, каляровы, 16 мм (расказвае аб аператары аўтаматызаваных сістэм).

**«Плазма»**, 2 часткі, каляровы, 16 мм.

**«Чалавек і вышыня»**, 2 часткі, каляровы, 35 мм. (расказвае аб неабходнасці вывучэння і засваення горных раёнаў зямнога шара).

**«Будзь карысны чалавецтву»**, 2 ч., каляровы, 16 мм. (аб акадэміку Ферсмане).

**«Альманах кінападарожнікаў»** № 188, 2 часткі, каляровы, 35 мм.

**«Жамчужына на беразе акіяна»**, 1 ч., каляровы, 35 мм (відавы фільм аб Далёкім Усходзе).

**«Прырода рэчываў змяненняў...»**, 2 ч., каляровы, 35 мм (дасягненні сучаснай біялогіі).

**«Ад усяго сэрца»**, 2 часткі, каляровы, 16 мм (Савецкі фонд міру).

**«Чалавек, машына, эмоцыі»**, 2 ч., 25 мм (інжынерная псіхалогія).

**«Генная інжынерыя на службе вытворчасці»**, 1 ч., каляровы, 35 мм.

**«Прырода ў бяспецы»**, 5 ч., каляровы, 35 мм.

**«Асабістая гігіена»**, 1 ч. ч/б, 16 мм.

Дадатковую інфармаыю аб кінафільмах вы можаце атрымаць у лабараторыі ТСН, (корпус № 1, 1—10).

Рэдактар Ул. БАЛОГА

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11. т. 57-16-52.

АЗ 11207

Заказ 368